ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 4 (1037) | ЧАЦВЕР, 27 лютага 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

2-ГА САКАВІКА – ВЫБАРЫ Ў МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ ДЭПУТАТАЎ РЭСПУБЛІКІ ДВАЦЦАЦЬ ЧАЦВЁРТАГА СКЛІКАННЯ

## ПРАГАЛАСУЕМ ЗА ДАСТОЙНЫХ

Арганізацыйныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенню важнай камńаніі завершаны, і не толькі ў нядзелю, 2-га сакавіка, а нават датэрмінова, пачынаючы з 25 лютага, выбаршчыкі маюць магчымасць прыйсці на выбарчыя ўчасткі і выканаць свой грамадзянскі абавязак, аддаць свае галасы за тых кандыдатаў у дэпутаты, якіх лічаць найбольш дастойнымі абараняць іх інтарэсы ў мясцовых органах улады.

Па Гомельскай вобласці ўтворана 4450 выбарчых акруг, у тым ліку па выбарах у абласны Савет дэпутатаў – 60, у раённыя – 784, гарадскія – 91, пасялковыя – 172. Найбольшая колькасць акруг – 3343 – утворана па выбарах дэпутатаў у сельскія Саветы. На Гомельшчыне функцыяніруе 313 Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў, у якія неабходна выбраць 4450 дэпутатаў – у кожнай акрузе па аднаму. Усяго вылучана звыш 4800 кандыдатаў у дэпутаты – ад працоўных калектываў, палітычных партый, грамадзянамі шляхам збору подпісаў.

Выбарчыя ўчасткі №23 і №28, якія размешчаны адпаведна ў вучэбных карпусах нашага універсітэта – №1 па вул. Савецкай, 108 і №2 па вул. Кірава, 119, уваходзяць у Пушкінскую выбарчую акругу №17 і Авіяцыйную выбарчую акругу №38.

**Кандыдатамі ў дэпутаты абласнога Савета дэпутатаў па першай з іх зарэгістраваны:**

**МАЛАХАЎ Аляксандр Уладзіміравіч**, 1952 г.н., рускі, адукацыя вышэйшая, інжынер-механік, член-карэспандэнт Беларускай інжынерна-тэхналагічнай Акадэміі. З 1993 г. – дырэктар Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Гомельскі аўтарамонтны завод". Дэпутат Гомельскага абласнога і гарадскога Савета 23 склікання. Член Партыі камуністаў Беларускай. Узнагароджаны ордэнам Пашаны Рэспублікі Беларусь.

**САКАЛОЎ Валерый Сяргеевіч**, 1948 г.н., беларус, адукацыя вышэйшая, інжынер-будаўнік, дырэктар па вытворча-эканамічных пытаннях таварыства з дадатковай адказнасцю "Спецыялізаваны цэнтр будаўніцтва і рамонту". Член камуністычнай партыі Беларусі.

**ТАМАШОЎ Міхаіл Віктаравіч,** 1964 г.н., беларус, адукацыя вышэйшая, інжынер-механік, старшы інспектар Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Інтэраўтатранс", член Ліберальна-дэмакратычнай партыі.

**Кандыдаты ў дэпутаты гарадскога Савета дэпутатаў па Авіяцыйнай выбарчай акрузе №38:**

**ГЛУШАКОЎ Юрый Эдуардавіч,** 1966 г.н., старшы навуковы супрацоўнік установы "Гомельскі абласны краязнаўчы музей", беспартыйны.

**МАЛАХАЎ Аляксандр Уладзіміравіч** (гл. вышэй).

**КІСЯЛЕЎСКІ Фёдар Міхайлавіч**, 1958 г.н., кіраўнік фермерскай гаспадаркі "Днепрагра", член Ліберальна-дэмакратычнай партыі.

**АДЗІНОЧАНКА Віктар Аляксандравіч**, 1962 г.н., дацэнт кафедры беларускай культуры Установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны", член Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Народная грамада".

Кандыдатам у дэпутаты гарадскога Савета па Хатаевіцкай выбарчай акрузе №39 зарэгістраваны першы прарэктар ГДУ імя Ф. Скарыны **КАРМАЗІН Аляксандр Пятровіч**. Ён будзе весці барацьбу за дэпутацкі мандат разам з яшчэ 4-ма прэтэндэнтамі.

## З УЗНАГАРОДАЙ!



*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ст.выкладчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёлін* ***ГІЛЕП Таццяна Юр'еўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

***

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці выкладчык кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы* ***КУЗНЯЦОВА Таццяна Андрэеўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

***

*За шматгадовую плённую працу, добрасумленнае выкананне сваіх службовых абавязкаў і ў сувязі з 55-годдзем з дня нараджэння галоўны ўрач санаторыя-прафілакторыя* ***САБАЛЕЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч*** *узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

## РАЗМОВА ПА ШЧЫРАСЦІ

***Сустрэчы кіраўніцтва нашага універсітэта са студэнцтвам, прафесарска-выкладчыцкім саставам, работнікамі ўсіх структурных падраздзяленняў ГДУ сталі ўжо традыцыйнымі. Чарговая з іх адбылася ў актавай зале 14 лютага, і ўдзел у ёй прыняў старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў к.э.н., дацэнт В.С. Сяліцкі.***

Рэктар прафесар М.В. Селькін выступіў з грунтоўнай справаздачай аб праведзенай ва універсітэце рабоце за тры апошнія гады. Ён падрабязна ахарактарызаваў усе напрамкі жыццядзейнасці ГДУ: вучэбную, навукова-даследчую, культурна-выхаваўчую, спартыўную работу. Прыводзілася шмат лічбаў і фактаў, якія красамоўна адлюстроўвалі стан спраў у нашай навучальнай установе. Улічваючы той факт, што бюджэтнае фінансаванне для ВНУ цяпер крайне недастатковае, універсітэт сам вымушаны шукаць спосабы і рэзервы для абнаўлення вучэбнай базы, рамонту карпусоў і студэнцкіх інтэрнатаў, і за апошні час у нас адбыліся прыкметныя зрухі



ў лепшы бок: выканана разнастайных рамонтных і аднаўленчых работ ва ўсіх карпусах, інтэрнатах на суму амаль 900 млн. руб., і толькі 28% з іх было затрачана з бюджэтнага фінансавання.

Па многіх паказчыках наш універсітэт займае ў рэспубліцы даволі высокія пазіцыі: расце яго кадравы і навуковы патэнцыял, адкрыты новыя спецыялізацыі, у вучэбны працэс укараняюцца сучасныя тэхналогіі, распрацавана і дзейнічае аўтаматызаваная сістэма кіравання па кантролю і за арганізацыяй вучэбна-метадычнай работы, 4 студэнцкія навуковыя лабараторыі адзначаны грантамі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для адораных навучэнцаў і студэнтаў, універсітэт мае магчымасць працаваць у лакальнай сетцы Інтэрнет. Ва ўласнасць універсітэту перададзены кінатэатр "Юбілейны", які стане магутным вучэбна-культурным комплексам, дзе можна будзе прымяняць новыя адукацыйныя тэхналогіі ў навучанні студэнтаў, заканчваецца будаўніцтва універсітэцкага спартыўнага комплексу па вул. Песіна.

Гэта далёка не поўны пералік тых здабыткаў і пазітыўных змен, што адбыліся ў нас за апошні час. Як адзначалася ў справаздачы рэктара, усё гэта дасягнута дзякуючы цеснай узаемасувязі, узаемаразуменню кіраўніцтва універсітэта з яго калектывам, уменню знаходзіць правільнае рашэнне ўзнікаючых пытанняў. Лягчэй за ўсё крытыкаваць, прасіць грошай на неабходнае, – падкрэсліў Міхаіл Васільевіч, – цяжэй, кожнаму рабіць сваю канкрэтную справу на рабочым месцы. І дзякуючы добрасумленнай працы членаў універсітэцкага калектыву, многага можна дасягнуць на карысць нашай ВНУ.

На сустрэчы з калектывам ГДУ выступіў старшыня абласнога Савета дэпутатаў В.С. Сяліцкі **(на здымку)**. Ён дэталёва ахарактарызаваў сацыяльна-эканамічнае становішча нашай вобласці, прывёў шмат лічбаў і фактаў, якія сведчаць аб тым, які нялёгкі перыяд перажывае зараз наша грамадства ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі. Як адзначалася, знаходзіць выйсце са складанага становішча давядзецца і сённяшнім студэнтам, будучым маладым спецыялістам, на якіх ускладваюцца надзеі і спадзяванні на пабудову грамадзянскага грамадства, асновай якога з'яўляецца мясцовае самакіраванне – Саветы дэпутатаў. Зусім хутка, 2 сакавіка, адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў рэспублікі дваццаць чацвёртага склікання. І ўсім нам неабходна выканаць грамадзянскі абавязак, зрабіць свой правільны выбар.

Старшыня прафкама студэнтаў Н.І. Колтышава, якая таксама выступіла на сустрэчы, гаварыла аб неабходнасці павелічэння памеру студэнцкай стыпендыі да ўзроўню мінімальнага спажывецкага бюджэту. Яна выказала падзяку абласной і гарадской уладам за аказаную дапамогу ў адкрыцці культурнага цэнтра "Юбілейны" і звярнулася з просьбай да В.С. Сяліцкага садзейнічаць хутчэйшаму ўвядзенню ў строй спартыўнага комплексу універсітэта па вул. Песіна.

Студэнты і выкладчыкі атрымалі адказы кіраўніцтва ГДУ на зададзеныя пытанні.

Карысць ад падобных сустрэч відавочная – як для кіраўніцтва ГДУ, так і для студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Адбываецца дзелавая і шчырая размова аб усім, што радуе і хвалюе, аб тым, як працаваць далей, каб універсітэт не здаваў заваяваных пазіцый і дасягаў новых рубяжоў.

**Т.НІКАЛАЕВА.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## АБАРОНА АЙЧЫНЫ – СВЯТЫ АБАВЯЗАК

**23-га лютага беларускі народ адзначыў Дзень абаронцаў Айчыны і 85-ю гадавіну Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.**

Сёлета свята праходзіла ў абстаноўцы актывізацыі агрэсіўнасці ЗША і НАТА, іх імкнення да гегеманізму, да дыктату і ваеннага ціску на непажаданыя ім краіны і ўрады з непрымальнай для іх унутранай і знешняй палітыкай, ігнаравання ААН.

Разам з тым гэты дзень святкаваўся ва ўмовах умацавання пазіцый нашай дзяржавы на міжнароднай арэне, далейшага пашырэння сувязей з краінамі блізкага і далёкага замежжа, умацавання саюза з Расіяй, паляпшэння патрыятычнага і ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі і насельніцтва рэспублікі.

Адносіны да Айчыны – гэта пачатак годнасці асобы чалавека. Яны вымяраюцца не словамі, а практычнымі справамі, і менавіта працай, службай, вучобай у імя Радзімы, надзейнай абаронай яе бяспекі, добрасумленным выкананнем канкрэтнай справы, якая даручана кожнаму з нас.

Для таго, каб быць сапраўдным абаронцам Радзімы, неабходна загадзя рыхтаваць сябе да гэтага. Гісторыя славянскіх народаў паказвае, што Радзіму абаранялі яшчэ з даўніх часоў аднолькава і мужчыны, і жанчыны, што асабліва ярка праявілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Памятайце пра гэта, юнакі і дзяўчаты, будзьце дастойнымі перайманнікамі абаронцаў нашай слаўнай Айчыны.

**Г.ЕЎДАКІМЕНКА,**
**падпалкоўнік у адстаўцы.**

## ЭКАНОМІМ!

***На падставе п.3 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27.12.02 г. і пісьма Міністэрства адукацыі РБ ад 14.01.2003 г. аб давядзенні заданняў па зніжэнню расходу паліўна-энергетычных рэсурсаў у 2003 г. на 10% да адпаведнага перыяду 2002 г. у нашым універсітэце выдадзены загад, у якім катэгарычна забараняецца:***

– выкарыстанне для абагравання каларыферных і самадзельных цеплавых установак;

– уключэнне прыточных сістэм вентыляцыі і цеплавых заслон;

– карыстацца з сістэмы ацяплення сеткавай вадой не па прызначэнню.

– пакідаць уключанымі свяцільнікі ў памяшканнях пры адсутнасці ў іх людзей; адкрытымі вокны, знадворныя дзверы і вароты гаражоў; адкрытымі водаразборныя краны пры невыкарыстанні вады; уключанымі прыборы, эл. пліты і абсталяванне, якія спажываюць электраэнергію, пры іх невыкарыстанні.

Усім камендантам будынкаў універсітэта неабходна строга праводзіць змяншэнне расходаў цепланосьбіта на ацяпленне ў ацяпляльны сезон пры плюсавых тэмпературах надвор'я; у студэнцкіх інтэрнатах строга прытрымлівацца работы душавых, кубавых па распрацаваных графіках, у іншы час гэтыя памяшканні закрываюцца на замок.

У выпадку невыканання дадзенага загаду да віноўных будуць прымяняцца адміністрацыйныя меры ўздзеяння.

# СПРАВА ЖЫВЕ Ў ВУЧНЯХ

**Слова "быў" не стасуецца з імем заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь У.В. Анічэнкі, хаця прайшло ўжо два гады, як яго няма сярод нас. Яго справа – выдатнага вучонага, педагога, грамадскага дзеяча – жыве. Яе працягваюць шматлікія яго вучні, калегі па працы. Аб гэтым яскрава засведчылі навуковыя чытанні, прысвечаныя памяці д.ф.н., прафесара У.В. Анічэнкі, што адбыліся на філфаку ГДУ.**

Яго пранікнёны позірк з партрэта на сцяне ў аўдыторыі, у якой сабраліся шматлікія ўдзельнікі канферэнцыі, быццам глядзеў у душу кожнага, хто прыйшоў сюды, каб нагадаць пра этапы яго жыцця, шлях у беларускай навуцы, успомніць яго не толькі як вучонага, але і проста як чалавека – са сваімі схільнасцямі і звычкамі.

Сваімі ўспамінамі адкрыў пленарнае пасяджэнне навуковых чытанняў ганаровы рэктар ГДУ, прафесар Л.А. Шамяткоў, якога вельмі ўражвалі ў гэтым чалавеку прынцыповасць і энергічнасць, чаму Леанід Аляксандравіч быў неаднойчы сведкай і ў час сумеснай працы з ім, і службовых камандзіровак (у прыватнасці, у Вялікабрытанію). Уладзімір Васільевіч ніколі не ішоў на здзелку з сумленнем, калі нешта супярэчыла яго поглядам.

У.В.Анічэнка падрыхтаваў і выхаваў цэлую плеяду высокакваліфікаваных кадраў – мовазнаўцаў, якія працуюць не толькі ў ГДУ, але і ў многіх ВНУ, навуковых калектывах вобласці, рэспублікі і за яе межамі.



Сярод першых яго вучняў – загадчыкі кафедр: беларускай культуры дацэнт Дз.Дз. Паўлавец і беларускай мовы д.ф.н., прафесар А.А. Станкевіч. Іх выступленні вельмі ёміста, усебакова раскрылі асобу свайго настаўніка – руплівца на ніве айчыннага мовазнаўства, гісторыі беларускай мовы, які шмат сіл і часу аддаў таксама вывучэнню і прапагандзе спадчыны асветніка і першадрукара Ф. Скарыны, за цыкл прац "Лінгвістычная Скарыніяна" быў удастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі і медаля імя Ф. Скарыны. Талент і эрудыцыя, прынцыповасць і патрабавальнасць, высокая працаздольнасць і пунктуальнасць – гэтыя ўласцівыя Уладзіміру Васільевічу якасці арганічна спалучаліся і з яго бацькоўскім клопатам аб сваіх вучнях па-за межамі кафедры, гатоўнасцю заўсёды даць любую параду, аказаць неабходную падтрымку, з аптымізмам і жыццялюбствам.

Чалавек энцыклапедычных ведаў, які дбайна ставіўся да роднай мовы, узбагаціў беларускае мовазнаўства сваімі фундаментальнымі навуковымі працамі, без каго не было ў нашым універсітэце музея-лабараторыі імя Ф. Скарыны – такім У.В. Анічэнка паўстаў з успамінаў члена-карэспандэнта НАН Б, д.ф.н., прафесара А.М. Булыкі, з якім Уладзімір Васільевіч працаваў разам у 70-я гады ў Інстытуце мовазнаўства, былога аспіранта, цяпер дацэнта Мазырскага пед-універсітэта А.К. Малюка, загадчыкаў кафедр ГДУ: рускай літаратуры – дацэнта Л.Л. Ермаковай, беларускай літаратуры – прафесара І.Ф. Штэйнера, рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства – прафесара У.І. Коваля.

Адбыліся таксама секцыйныя пасяджэнні, на якіх было заслухана шмат дакладаў удзельнікаў навуковых чытанняў па розных раздзелах мовазнаўства, а таксама літаратуры і фальклору.

**Чытанні, прысвечаныя памяці выдатнага вучонага і педагога У.В. Анічэнкі, стануць ва універсітэце традыцыйнымі.**

**Т.НІКАЛАЕВА.**

СПОРТ

# ФІНІШАВАЛА СПАРТАКІЯДА "ЗДАРОЎЕ"

Завяршылася чарговая спартакіяда "Здароўе" сярод прафесарска-выкладчыцкага саставу, супрацоўнікаў і аспірантаў універсітэта па чатырох відах спорту. На яе старты выйшлі 125 чалавек.

У спаборніцтвах па настольнаму тэнісу прызавая тройка каманд наступная: факультэт фізічнай культуры, эканамічны і фізічны факультэты. У турніры па міні-футболу на п'едэстал гонару ўзышлі факультэт фізічнай культуры, матэматычны і геолага-геаграфічны. У валейбольных баталіях прыемна здзівіла каманда геолага-геаграфічнага факультэта, якая стала пераможцай, на наступных месцах – факультэт фізічнай культуры і фізікі.

У спаборніцтвах па шахматах зноў, як і ў ранейшыя гады, перамогу атрымала каманда матфака, на другім месцы – эканамісты і на трэцім (насуперак прагнозам) – факультэт фізічнай культуры.

Агульнакамандны залік вызначаўся не толькі па выніках спаборніцтваў, але па колькасці ўдзельнікаў ад кожнага факультэта.

Па выніках спартакіяды месцы размеркаваліся ў наступным парадку: факультэт фізічнай культуры – 86 ачкоў, матэматычны – 42, эканамічны – 28, геолага-геаграфічны – 25, фізічны – 24, біялагічны – 12, замежных моў – 7, псіхолагі – 6, філолагі – 2 і гісторыкі –1.

Спартакіяда прайшла на высокім арганізацыйным узроўні.

**В. МАРЧАНКА.**



# ВЫДАТНЫ ПОСПЕХ ПЛЫЎЦОЎ

У г. Наваполацку прайшоў 76-ы зімовы адкрыты чэмпіянат Беларусі па плаванню. У спаборніцтвах прымалі ўдзел усе мацнейшыя плыўцы рэспублікі і госці з Латвіі.

Барацьба была вельмі напружанай – спартсмены разыгрывалі пуцёўкі на чэмпіянат свету ў гэтым відзе спорту. У саставе зборнай каманды Гомельскай вобласці як заўсёды выступалі і мацнейшыя плыўцы нашага універсітэта, студэнты факультэта фізічнай культуры. Яны здолелі ўнесці свой важкі ўклад у агульную перамогу. Першакурснік майстар спорту міжнароднага класа Сяргей Шаўко заняў 1-е месца ў заплывах на спіне на дыстанцыях 50, 100, 200 м. Трэцякурснік майстар спорту Станіслаў Невяроўскі паказаў другі вынік на вадзяной дарожцы 200 м вольным стылем і заняў 3-е месца на дыстанцыях 50 і 100 м. Узняўся на трэцюю прыступку і трэцякурснік майстар спорту Мікалай Ганчароў пасля заплываў брасам на блакітных дарожках у 50 м і ўдвая даўжэйшай.

Усе яны ўдзельнічалі ў камбінаваным эстафетным квартэце 4х100 м, у складзе якога сталі чэмпіёнамі і рэкардсменамі Рэспублікі Беларусь.

**І.КАРНЕЕНКА,**
**выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту.**

# КНІГА – НЕ ТОЛЬКІ ДУХОЎНАЯ КРЫНІЦА

Гомельская абласная арганізацыя грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства "Кніга" запрашае да супрацоўніцтва энергічных студэнтаў для распаўсюджвання літаратуры.

Звяртацца па адрасу: г. Гомель, вул. Жаркоўскага 24, 1 паверх, тэл.: 777-600.



Ў зімовым парку. **Фота У.ЧЫСЦІКА.**



# СЯРОД ЛЕПШЫХ СПАРТСМЕНАЎ

Па выніках апытання спартыўнай грамадскасці вобласці, якое праводзілася ў канцы 2002 г., лепшымі названы 12 прадстаўнікоў розных відаў спорту: лёгкай і цяжкай атлетыкі, спартыўнай гімнастыкі, веславання на байдарках і каноэ, дзюдо, грэка-рымскай барацьбы і інш. Сярод іх ёсць і выхаванцы нашага універсітэта. Гэта – майстар спорту міжнароднага класа па дзюдо, уладальнік двух сярэбраных медалёў чэмпіянату Еўропы, студэнт 5 курса завочнага факультэта **Сяргей КУХАРЭНКА**; майстар спорту міжнароднага класа па фрыстайлу, удзельніца XIX зімовых Алімпійскіх гульняў, уладальніца Кубка свету, студэнтка 3 курса завочнага факультэта **Ала ЦУПЕР**; выпускнікі ГДУ – заслужаны майстар спорту па лёгкай атлетыцы, бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы (сямібор'е) **Наталля САЗАНОВІЧ**; майстар спорту міжнароднага класа па грэка-рымскай барацьбе, бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы **Вячаслаў МАКАРАНКА**.

Цырк

# «МАЙ – СЁННЯ І КОЖНЫ ДЗЕНЬ»

На сённяшні дзень цырк – гэта адно з нямногіх месцаў у нашым горадзе, дзе можна ад душы павесяліцца і пасмяяцца.



У сёлетнім сезоне аматараў цыркавога мастацтва чакае шмат цікавага і захапляючага. Напрыклад, адпачыць душою, узняцца над паўсядзённасцю многім дапаможа праграма «Май – сёння і кожны дзень», якая ідзе зараз у Гомельскім цырку. Удзел у ёй прымаюць сапраўдныя зоркі – як вялікія, так і малыя. І, відаць, даўно ў нас не былі так шырока прадстаўлены розныя жанры гэтага старажытнага віду мастацтва.

Вас чакае сустрэча з атракцыёнам «Акрабаты-вальтыжоры», удзельнікам якога апладыравалі гледачы Японіі і Швецыі, Венгрыі і Францыі.

Безумоўна, у гэтай праграме ўсім спадабаецца паветраная гімнастыка, якая прадстаўлена нумарам «Парная трапецыя» пад кіраўніцтвам А.С. Парфільева. Калі артысты ў паветры – не памятаеш пра тую ніць, якая звязвае чалавека з зямлёй, ловіш сябе на думцы, што зямное прыцяжэнне на іх нібы не распаўсюджваецца.

Прыгожы і грацыёзны конь у нумары «Вышэйшая школа верхавой язды» пад кіраўніцтвам Н.Б. Майхроўскай з вялікім прафесійным майстэрствам прадстаўляе на нашым манежы гэты жанр.

**Мастацтва цырка хвалюе, здзіўляе і захапляе. Шмат чаго нечаканага адбываецца на магічным кругу манежа.**

Літаральна ўсё ў праграме захапляе, але нельга не назваць нумар з нумароў – «Марскія жывёлы» пад кіраўніцтвам Г.А. Майхроўскай. Не кожнаму майстру цыркавога мастацтва дадзены талент адшукаць падыход да пінгвінаў. Як прызнаецца Галіна Аляксееўна, «каб дасягнуць мэты, трэба быць вытанчаным у сваіх пошуках».

Вясёлая каляровая кропка на кончыку носа, крышачку намаляваны бровы, рот – вось і ўвесь грым добразычлівага і простага клоуна Мая. Ніхто – ні дарослыя, ні дзеці – не чакаюць ад яго ніякага падвоху, калі ён падыходзіць да каго-небудзь і прапануе «пагуляць у клоуна» разам з ім. На яго жарты адклікаюцца адразу, а потым усе разам да слёз смяюцца. Яго смех нараджаецца з дабрыні і даверу.

Шчаслівыя ўсмешкі дарослых і дзяцей пры кожным з'яўленні Мая і ствараюць тую святочную атмасферу, у якую кожны з вас зможа акунуцца, калі прыйдзе на гэтае прадстаўленне.

Акрамя таго, вас чакае сюрпрыз. Ён заключаецца ў тым, што вы зможаце... Але, што гэта за сюрпрыз, калі ўсё вядома? Лепей усё ўбачыць сваімі вачыма.

**Ганна УВАРАВА,**
**студэнтка 1-га курса філфака.**

Усміхніцеся ☺☺☺

# ЭТАПЫ СТУДЭНЦКАГА ЖЫЦЦЯ

*ЖЫЦЦЁ СТУДЭНТА – вайна і мір; як гартавалася сталь.*

*ВУЧОБА СТУДЭНТА – хаджэнне па пакутах.*

*ЧАС КАНІКУЛ – прамень святла ў цёмным царстве.*

*КАНСПЕКТ – запіскі вар'ята.*

*ПАДРЫХТОЎКА ДА ЭКЗАМЕНАЎ – дні і ночы.*

*ЧАС ЭКЗАМЕНАЎ – разгром.*

*ПАСЛЯ ЭКЗАМЕНА – гора ад розуму.*

*СЫХОД З ЛЕКЦЫІ – пабег з катаргі.*

*УРОК ФІЗКУЛЬТУРЫ – выходжу адзін я на дарогу.*

*ВЫКЛАДЧЫК ФІЗКУЛЬТУРЫ – хто над намі ўверх нагамі.*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

– ВМ і праграміравання – дацэнта;

– эканомікі і кіравання вытворчасцю – ст. выкладчыка.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14.
Тэл. 56-30-71.
E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4099
Падпісана да друку 24.02.2003 г.